# ВОДЗЫЎ

на аўтарэферат дысертацыі
**Мурашкі Наталлі Уладзіміраўны**
«Мадэляванне маўленчага адукацыйнага асяроддзя
сродкамі фальклору на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі», прадстаўленай
на саісканне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук па спецыяльнасці
13.00.02 – тэорыя і методыка навучання і выхавання
(вучнёўскай і студэнцкай моладзі)

Дысертацыйнае даследаванне Мурашкі Н.У. з'яўляецца своечасовым для сучаснай педагагічнай навукі і практыкі. Актуальнасць прапанаванай тэмы даследавання вызначаецца патрэбай грамадства ў асобе, якая на высокім узроўні валодае роднай мовай як сродкам камунікацыі, што патрабуе стварэнне спецыяльных умоў у сітуацыі незбалансаванага блізкароднаснага білінгвізму і пошуку сродкаў фарміравання такой асобы. Інавацыяй у дадзеным накірунку з'яўляецца зварот да фальклору, да выкарыстання яго патэнцыялу для стварэння маўленчага адукацыйнага асяроддзя.

Аўтарэферат дысертацыі дазваляе вылучыць станоўчыя моманты работы. Перш за ўсё, неабходна падкрэсліць дакладнасць і несупярэчлівасць навуковага апарата даследавання, асноўныя палажэнні якога паслядоўна раскрыты ў рабоце. Акрамя таго, абапіраючыся на адэкватныя метадалагічныя пазіцыі і метады тэарэтычнага і эмпірычнага даследавання, аўтарам праведзены глыбокі аналіз працэсу мадэлявання маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі; удакладнены сутнасць і структура маўленчага адукацыйнага асяроддзя, апісана яго структура; выяўлены і абгрунтаваны патэнцыял фальклору для мадэлявання маўленчага адукацыйнага асяроддзя, сканструявана мадэль стварэння маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору.

Вартасцю дысертацыі, зыходзячы з прадстаўленых у аўтарэфераце матэрылаў, з'яўляецца распрацаваная аўтарам модульная методыка фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў праз вывучэнне фальклорных твораў, якая выступае механізмам функцыянавання маўленчага адукацыйнага асяроддзя.

Практычная значнасць праведзенага даследавання складаецца ў магчымасці выкарыстання яго вынікаў (фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў праз вывучэнне фальклорных твораў і яе метадычнага забеспячэння) у практыцы работы настаўнікаў пачатковых класаў ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі як з рускай мовай, так і беларускай мовай навучання.

Вынікі даследавання адлюстраваны ў публікацыях аўтара: па тэме дысертацыі апублікаваны 6 артыкулаў у навуковых часопісах, уключаных у пералік ВАК, а таксама 2 артыкулы ў навуковых часопісах і 2 метадычныя дапаможнікі. Асобныя палажэнні і вынікі даследавання дакладваліся на 11 міжнародных навукова-практычных канферэнцыях, былі прадстаўлены на трох міжнародных і адным рэспубліканскім навуковым конкурсах.

Аднак хацелася б звярнуць увагу на тое, што, адзначаючы неабходнасць канструявання адукацыйнага працэсу на аснове актуалізацыі патэнцыялу фальклорных твораў, канстатуючы выхаваўчыя магчымасці фальклору (яго уплыў на каштоўнасна-мэтавыя ўстаноўкі і матывы авалодання беларускай мовай, фарміраванне ўяўленняў пра нацыянальную культурную спадчыну), даследчык фактычна абмяжоўваецца разглядам уплыву фальклору на матывы вывучэння беларускай мовы, а адбор твораў для вывучэння ажыццяўляўся з улікам толькі іх маўленчага і камунікатыўнага патэнцыялу (с. 11). Лічым, што ў кантэксце сучасных адукацыйных прыярытэтаў, у даследванні мэтазгодна было больш увагі надаць выхаваўчаму аспекту праблемы.

Адзначаныя заўвагі не зніжаюць значнасць праведзенага даследавання і не ўплываюць на высокую яго ацэнку.

Дысертацыя Мурашкі Наталлі Уладзіміраўны «Мадэляванне маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі» выканана ў адпаведнасці з патрабаваннямі дзеючага палажэння кандыдацкіх дысертацый адпаведнай навуковай галіны, мае навуковае і практычнае значэнне, а яе аўтар заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.02 – тэорыя і методыка навучання і выхавання (вучнёўскай і студэнцкай моладзі).

Загадчык кафедры тэорыі і
методыкі пачатковай адукацыі
МДУ імя А.А. Куляшова,
кандыдат педагагічных навук,
дацэнт — С.П. Чумакова

Подпись
заверяю
отдела кадров
учреждения образования
«Могилёвский государственный
университет имени А.А. Кулешова»